**М. Д. КАРДАШ**
Навуковы кіраўнік – У. В. Здановіч

## ПРАБЛЕМА ВЫЗНАЧЭННЯ ПЕРШАЙ СТАЛІЦЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Ужо больш за стагоддзе паміж гісторыкамі краін Усходняй Еўропы не існуе пагаднення ў пытанні вызначэння першай сталіцы Вялікага Княства Літоўскага. На наш погляд, пры спробе выяўлення яе лакалізацыі на сярэдзіну XIII ст. звычайна пераносіцца сучаснае ўяўленне пра дзяржаўную сталіцу як пра сталае месца знаходжання правіцеля і кіруючай эліты. І да таго ж час ад часу ў адзінае цэлае зліваюцца такія паняцці, як месца каранацыі Міндоўга, першага літоўскага манарха, а таксама размяшчэнне яго двара і штодзённага месцазнаходжання. Мэта дадзенага артыкула – спроба размежавання згаданых паняццяў і адказу на пытанне, ці з'яўляецца гістарычна карэктным сцвярджаць аб існаванні сталай дзяржаўнай сталіцы ў часы гаспадарання Міндоўга, які значную частку свайго гаспадарання тытулаваўся каралём Літвы.

Спынімся на спробе высвятлення звычайнага месца прабывання першага літоўскага гаспадара. У канцы 1248 г. [2, с. 67], калі пад уладай Міндоўга, акрамя яго радавой вотчыны ("Літвы Міндоўга"), ужо знаходзіліся такія пераважна ўсходнеславянскія гарады, як Наваградак, Гародня, Слонім і Ваўкавыск, першапачаткова заглыбленыя ў карэнныя балцкія землі са шчыльным пражываннем мясцовага насельніцтва [5, с. 23, 24; 4, с. 197], Міндоўг выпраўляе з гістарычнай Літвы сваіх пляменнікаў, князёў Таўцівіла і Едзівіда, у паход на Смаленск і, каб пазбавіць жыцця, услед накіроўвае ўласныя войскі, а ў той час "за ворожство съ ними Литву заня, поймана бе вся земля Литовская и бесчисленное имение ихъ, притрено бе богатьство ихъ" [8, с. 187]. Менавіта дадзеная падзея лічыцца непасрэдным пачаткам утварэння будучага Вялікага Княства Літоўскага [1, с. 73; 3, с. 67, 68; 6, с. 184]. Як сведчыць летапісец, выпраўленыя князі даведаліся аб здрадзе родзіча і адразу ж адправіліся ў іншым накірунку – у Галіцка-Валынскае княства, дзе заключылі хаўрус з Данілам Раманавічам. І ўжо на рубяжы 1249–1250 гг. [2, с. 67] галіцка-валынскія князі Даніла і Васілька выступілі ў паход супраць Міндоўга. Але пайшлі яны "къ Новугороду" [8, с. 187]. Дадзенае ўскоснае сведчанне наводзіць на меркаванне, што на момант паходу канца 1249 г. Міндоўг і яго атачэнне сапраўды маглі знаходзіцца ў Наваградку.

Паход супраць узнікаючай дзяржавы паўтарыўся ў наступным, 1250 г. [6, с. 37], але ўжо з удзелам рыцараў Лівонскага ландмайстарства Тэўтонскага ордэна. Старэйшая лівонская рыфмаваная хроніка распавядае,

Рэпазіторый БрДУ

як крыжаносцы рушылі на Літву дзеля непасрэднага сутыкнення з сіламі Міндоўга, які, у сваю чаргу, асабіста не прыняў бітвы і застаўся ў сваёй крэпасці, назва якой не ўдакладняецца: "…der meister wolde schowen wie kunic Myndowe mochte, ob er zü strite tochte. der kunic in siner burge lac" [13, с. 77, верш 3325]. Мяркуючы па ўсім, згаданая крэпасць знаходзілася ўжо ў іншай мясцовасці.

У такіх складаных умовах прыняццем каталіцкага хросту ў пачатку 1251 г. князь Міндоўг здолеў вывесці з варожага хаўрусу лівонскіх крыжаносцаў, якія ад таго часу пачалі змагацца на баку Літвы. У Старэйшай лівонскай рыфмаванай хронікі змешчаны аповед, як напярэдадні хрышчэння лівонскі ландмайстар Андрэас фон Сцірлад прыбыў ва ўладанне літоўскага гаспадара, дзе жаданых гасцей прымалі з вялікай пашанай. На сустрэчы прысутнічала і жонка Міндоўга [13, с. 80, верш 3470], пазней вядомая як каралева Марта. Падобныя безыменныя ўладанні, дзе манарх прыбывае з сям'ёй і прымае пасольствы, згадваюцца храністам даволі часта, але з-за адсутнасці грунтоўных апісанняў складана рабіць пераканальныя вынікі [13, с. 83, верш 3595; с. 146, верш 6360, 6365; с. 149, верш 615; с. 159, верш 6945].

Галіцка-Валынскі летапіс даводзіць, што ў тым жа 1251 г. выгнаны з Літвы Таўцівіл з войскам яцвягаў, жамойтаў князя Вікінта, русінаў і палаўцаў Данілы Раманавіча выступіў з Жамойцкай зямлі на дзяржаву Міндоўга, а сам гаспадар з дапамогай лівонскіх рыцараў абараняўся ад аб'яднаных сілаў у невядомым да таго часу горадзе пад назвай Варута, адкуль, мяркуючы па ўсім, пазней выступіў на Жамойць у паход: "Миндъвгъ… вниде во град, именемъ Ворута, и высла шурина своего нощь и розагнаша и Русь и Ятвязе… И приде Миндовгъ, собрав силу велику, на город Выкинтовъ, именем Твиреметъ…" [8, с. 188]. Як бачна, у дадзеным выпадку магчыма напаткаць канкрэтную мясцовасць гістарычнай Літвы, у якой пэўны час знаходзіўся манарх, яго прыбліжаныя і надворнае войска. Мяркуючы па ўсім, Варута з'яўлялася адной са шматлікіх крэпасцей Міндоўга, і, на наш погляд, складана бясспрэчна атаясамліваць з ёй кожнае безыменнае месца знаходжання гаспадара, прыгаданае ў Старэйшай лівонскай рыфмаванай хронікі.

Пасля паходу Міндоўга на Жамойць, падчас якога "многымъ же ратьнымъ бившимся (бывшимъ) межи ими", гаспадар Літвы "возвратися в землю свою", а князь Таўцівіл, у сваю чаргу, адправіў Данілу Раманавічу пасланне: "Пойди къ Новугороду". І на рубяжы 1251–1252 гг. [2, с. 68] Даніла Раманавіч з войскам выправіўся на Панямонне і "плениша всю землю Новогородьскую" [8, с. 188]. Зыходзячы з вышэйадзначанага, магчыма меркаваць, што з Жамойці літоўскі манарх, якога так упарта спрабаваў забіць Таўцівіл, вярнуўся ў Наваградак.

Рэпазіторый БрДУ

Паходы галіцка-валынскіх князёў на Літву ў бліжэйшы час паўтараліся яшчэ двойчы. У тым жа 1252 г. – на Гародню [8, с. 188], а ў канцы 1252 г. “Данилови же пошедшу на войну на Литву, на Новъгородокъ” [8, с. 191]. Пры тым, на вялікі жаль, не захавалася нават ускосных сведчанняў, у якім месцы на той момант знаходзіўся двор літоўскага гаспадара.

У ліпені 1253 г. Міндоўг каранаваўся на караля Літвы. Спынімся на гэтай падзеі. Як тое ні дзіўна, тагачаснымі крыніцамі месца каранацыі не згадваецца. Але пачынаючы ад эпохі Рэнесансу асобы, што працавалі над сваімі гістарычнымі творамі на землях Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага, спыняліся на адным сцверджанні – Наваградак.

Так, “Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсея Русі” аўтарства Мацея Стрыйкоўскага, складзеная ў 1570-я гг. [10, с. 721], распавядае, як Папа Рымскі Інацэнт IV выслаў свайго легата, біскупа хелмскага Гейндэрыка, які разам з архібіскупам рыжскім і крыжаносцамі прускімі і лівонскімі прыбыў у Наваградак Літоўскі (“do Novogrodka Litewskiego”), дзе Міндоўга на каралеўства Літоўскае ўзняў [12, с. 289].

Войцэх Каяловіч, аўтар першай грунтоўнай “Гісторыі Літвы”, дзве часткі якой пабачылі свет у 1650 і 1669 гг. адпаведна [10, с. 79], у сваім творы яшчэ больш падрабязна распісаў абставіны цырымоніі, удакладніўшы, што каранацыя Міндоўга адбывалася на палях Наваградскіх з той прычыны, што ў Наваградку немагчыма было знайсці такога вялікага збудавання: “in campis Novogrodenfibus (neque enim Novogrodeci tam amplae aedes haberi poterant)” [11, с. 97]. Прыведзенае дэталёвае сцверджанне Войцэха Каяловіча дазваляе лічыць, што гісторык, мяркуючы па ўсім, карыстаўся крыніцамі, якія, на вялікі жаль, да нашага часу не захаваліся.

Падобныя звесткі існуюць і ў Густынскім летапісе, летапісным помніку апошняй трэці XVII ст. [9, с. 2]: “В то жъ лѣто великий князь Литовъский Миндовгъ коронованъ бысть на кролевство Литовъское въ Новогродку за благословениемъ папы Инокентия през Генърика, бискупа Хелмского (въ Прусѣхъ), каръдинала папежского” [9, с. 121–122].

Зыходзячы з вышэйпрыведзеных звестак і ўлічыўшы, што іншага месца, акрамя Наваградка, ні тагачасныя, ні пазнейшыя гістарычныя творы не згадваюць, магчыма прыняць, што каранацыя Міндоўга, мяркуючы па ўсім, сапраўды адбывалася на Наваградчыне. На наш погляд, сцверджанне Войцэха Каяловіча заслугоўвае асаблівай увагі.

Мір паміж Літвой і Галіцка-Валынскай дзяржавай быў заключаны ў 1254 г., на наступны год пасля атрымання Міндоўгам кароны. Пры тым пагадненне падпісваў не гаспадар Літвы, а яго старэйшы сын Войшалк, які, як высвятляецца з пазнейшага летапіснага паведамлення, яшчэ пры айцоўскім жыцці стаў княжыць у Наваградку, дзе і быў першапачаткова ахрышчаны, яшчэ да 1254 г. [8, с. 201]. Тое яшчэ раз наводзіць на мерка-

Репозиторий БрГУ

ванне, што гаспадар не заўсёды знаходзіўся у Наваградку, як і ў любых гарадах і ўмацаваннях краіны, а штодзённае кіраванне багацейшым горадам свайго гаспадарства даручыў старэйшаму сыну. Па адной з умоваў пагаднення, Войшалк "передае" Наваградак ад Міндоўга Раману Данілавічу, а сам, прыняўшы манаскі пострыг, адбывае ў Холм – сталіцу Галіцка-Валынскага княства [8, с. 192].

Такім чынам, ад 1254 г. Раман Данілавіч прыбывае ў Наваградак замест Войшалка, але "перададзены" горад, як высвятляецца пазней, так і застаўся пад непасрэдным уладараннем літоўскага манарха. Справа ў тым, што ўжо ў 1255 г. [2, с. 68] "присла же Миндовг къ Данилу: пришлю къ тобе Романа и Новогородце, абы пошелъ ко Возвяглю, оттуда и къ Кыеву…"; "Данило же съ братомъ идоша ко Возвяглю жяя вести отъ Романа и Литвы. Романови же пришедшу ко граду п Литве (с Литвой)… Се бо беша людіе Миндогови и воевода ихъ Хвалъ… и Сиръвидъ Рюшковичь…" [8, с. 195]. Прыведзеныя запісы яскрава паказваюць, што, па-першае, Раман Данілавіч, знаходзячыся ў Наваградку, як і Войшалк у свой час, быў непасрэдна падпарадкаваны Міндоўгу і, па-другое, наваградцы, якіх гаспадар выправіў з Раманам і якіх у наступным запісе аўтар называе Літвой, з'яўляліся "людзьмі Міндоўга". Такім чынам, магчыма сцвярджаць, што ўнутранае ўладкаванне дзяржавы істотна не змянілася. Змяніўся толькі князь багацейшага горада Літвы, які падпарадкоўваецца літоўскаму гаспадару. Але ўжо ў 1258 г., пасля аднаўлення вайсковых дзеянняў з боку Галіцка-Валынскага княства, змушанага выступіць супраць Міндоўга па загадзе манголаў, Войшалк, які яшчэ раней вярнуўся на Айчыну і збудаваў на Нёмане ўласны манастыр, змовіўшыся з тагачасным полацкім князем, захоплівае Рамана Данілавіча, далейшы лёс якога невядомы [2, с. 69; 6, с. 41; 8, с. 197, 201]. Ад таго часу і да смерці Міндоўга ў 1263 г. даследчыкамі заўважана ўзрастанне вайсковай магутнасці той маладой сярэднявечнай дзяржавы [7, с. 208], што, на наш погляд, сведчыць пра ўнутраную еднасць і непарушнасць зараджаючагася Вялікага Княства Літоўскага.

Такім чынам, зыходзячы з усяго адзначанага, выпадае лічыць, што ў часы Міндоўга сталага месца прабывання гаспадара, мяркуючы па ўсім, не існавала. На карысць дадзенага сцверджання ўскосна могуць служыць звесткі граматы ад ліпеня 1253 г., выдадзенай ад гаспадарскага імя, і граматы ад чэрвеня 1260 г., падробленай лівонскімі крыжаносцамі, у якіх прысутнічаюць наступныя словы: "Дадзена ў Літве, на нашым двары Datum in Lettowia in curia nostra/Datum Lettowie in curia nostra") [4, с. 25, 39]. Непасрэднае месца стварэння дакументаў не ўдакладняецца як у прыведзеных граматах, так і ў кожнай з захаваных [4, с. 23–44]. Магчыма меркаваць, што манарх, яго сям'я, бліжэйшае атачэнне і надворнае войска

Рэпазіторый БрДУ

у сувязі з нескончальнымі вайсковымі паходамі, сутыкненнямі і разнастайнымі гаспадарскімі справамі маглі з'яўляцца ў любой частцы дзяржавы, і з гэтай прычыны любы горад альбо ўмацаванае паселішча падчас знаходжання ў ім гаспадарскага двара, на наш погляд, магчыма лічыць тагачаснай дзяржаўнай сталіцай.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 2. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экоперспектива, 2008. – 688 с. : іл.
2. Грушевський, М. Хронольогія подій Галіцько-Волинської літописи / М. Грушевський // Записки Наукового товариства імени Шевченка. – Львів, 1901. – Т. 41. – С. 1–72.
3. Ермаловіч, М. Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае / М. Ермаловіч. – Мінск : Беллітфонд, 2000. – 448 с.
4. Жлутка, А. Міндаў, кароль Літовіі, у дакумэнтах і сьведчаннях = Mindowe, rex Lithowiae, in litteris et testimoniis / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад., пер. на беларус. мову, камэнт. А. Жлуткі. – Мінск : Тэхналогія, 2005. – 135 с., [16] арк. іл.
5. Зверуго, Я. Г. Верхнее Понёманье в IX–XIII вв. / Я. Г. Зверуго ; под ред. П. Ф. Лысенко. – Минск : Навука і тэхніка, 1989. – 208 с.
6. Краўцэвіч, А. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага 1248–1377 г. / А. Краўцэвіч. – Гародня ; Уроцлаў, 2015. – 302 с.
7. Краўцэвіч, А. К. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага / А. К. Краўцэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 208 с.
8. Полное собрание русских летописей. Т. 2. Ипатьевская летопись. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1843. – 379 с.
9. Полное собрание русских летописей. Т. 40. Густынская летопись. – СПб. : Дмитрий Буланин, 2003. – 202 с.
10. Вялікае Княства Літоўскае : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. З. Э. Герасімовіч. – 2-е выд. – Мінск : БелЭн, 2007. – 792 с. : іл.
11. Historiae Lituanae Pars prior; De rebus Lituanorum Ante susceptam Christianam Religionem, conjunctionemque magni Lituaniae Ducatus cum Regno Poloniae, libri novem. Auctore P. Alberto Wiiuk Koialowicz, Soc. Iesu S.TH.D. Dantisci, 1650. – 399 P.
12. Kronika polska, litewska, zmodska i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego. T. 1. – Warszawa, 1846. – 392 s.
13. Livländische Reimchronik / Herausgegeben von Leo Meyer. – Paderborn, 1876. – 416 S.


Репозиторий БрГУ